ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*
### *LITERARY SCIENCE*

УДК 821.161.3.09-1«1921/1939» Паступіў у рэдакцыю 01.02.2022
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-3-309-319 Received 01.02.2022

**М. У. Мікуліч**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ЗАБЫТЫЯ СТАРОНКІ ЛІТАРАТУРНАЙ ГІСТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**Аннотация.** Анализируются забытые, малоизученные страницы западнобелорусской поэзии 1920–1930-х гг., идейно-эстетические поиски Янки Былины, Станислава Станкевича, Улад-Иницкого. Творчество поэтов рассматривается в контексте острых социально-экономических и духовно-национальных проблем и противоречий действительности, в русле традиций ведущего лирико-повествовательного стилевого направления отечественной литературы.

Отмечается сюжетно-новеллистическая природа стихов Я. Былины, которые характеризовались спокойной повествовательной тональностью, объективизированной образностью. Рассматривается склонность С. Станкевича к сатирико-юмористическому выявлению общественно-социальных обстоятельств и внутреннего мира человека, а также к использованию тем, мотивов и образов социально-этнографического наполнения. Подчеркивается вовлеченность Улад-Иницкого в национально-патриотическую проблематику, обращение поэта к символической образности и др.

**Ключевые слова:** творческая индивидуальность, образ, национально-освободительный, лирический герой, христианско-религиозный, сатирический пафос, лирико-повествовательный, стилевое течение, предметно-изобразительный

**Для цитирования:** Мікуліч, М. У. Забытыя старонкі літаратурнай гісторыі Заходняй Беларусі / М. У. Мікуліч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2022. – Т. 67, № 3. – С. 309–319. https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2022-67-3-309-319

**Mikalai U. Mikulich**

*Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches
of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## FORGOTTEN PAGES IN THE LITERARY HISTORY OF WESTERN BELARUS

**Abstract.** The forgotten, insufficiently explored pages of West-Belarusian poetry in the 20s – 30s of the XX century and Yanka Bylina, Stanislau Stankevich, Ulad-Initsky's ideological and esthetic searches are analyzed in the article. The creative work of poets is seen in the context of acute socio-economic, spiritual and national problems and contradictions of reality, in line with the traditions of the leading, lyrical and narrative, style trends of national literature.

The author notes the plot and novelistic nature of Y. Bylina's verses which were characterized by a quiet narrative tone, objectified imagery, S. Stankevich's inclination to the satirical and humorous identification of the social circumstances and the internal world of man, to the use of themes, motives and images of social and ethnographic fillings, underlines Ulad-Initsky's engagement in national patriotic issues, poet's appeal to symbolic imagery, etc.

**Keywords:** creative individuality, image, national-liberation, lyrical hero, Christian-religious, satirical pathos, lyrical and narrative, stylistic current, object-imaginative

**For citation:** Mikulich M. U. Forgotten Pages in the Literary History of Western Belarus. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2022, vol. 67, no. 3, pp. 309–319 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2022-67-3-309-319

**Уводзіны.** Адным з самых маладаследаваных у гісторыі беларускага слоўнага мастацтва і па сённяшні дзень з'яўляецца пласт заходнебеларускай літаратуры 1920 – 1930-х гг. Мала звярталіся да яго ў ранейшыя, савецкія, часы, калі ён быў яшчэ не такі гістарычна аддалены, калі

© Мікуліч М. У., 2022

жылі і тварылі многія рэальныя дзеячы народна-патрыятычнага руху і літаратурна-мастацкага працэсу ў тагачасным «забраным краі». Свежымі, гарачымі былі ўспаміны і ўражанні ад канкрэтных грамадска-палітычных і сацыяльна-культурных з'яў і падзей, пачынаючы ад самога Рыжскага дагавора 18 сакавіка 1921 г., пераследу і катаванняў беларускіх патрыётаў у польскіх пастарунках і астрогах і заканчваючы вераснёўскім (1939 г.) паходам Чырвонай Арміі. Мала звяртаюцца да яго і зараз, на этапе навейшай гісторыі. А між тым гэта надзвычай цікавы, своеадметны і ўдзячны для даследчыкаў у плане разумення ўсёй той складанай міжваеннай эпохі матэрыял, асабліва паэзія Заходняй Беларусі.

**Асноўная частка.** Без перабольшання можна сказаць, што паэзія Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) – унікальная з'ява на літаратурнай карце Еўропы ХХ стагоддзя. Прадуцыруючы на глебе нацыянальных духоўна-сацыяльных і ідэйна-мастацкіх традыцый і каштоўнасцей, яна ва ўмовах Польшчы з'яўлялася часткай адначасова агульнабеларускага і польскага грамадска-культурнага асяроддзя, цесна ўзаемадзейнічаючы з прыбалтыйскім (найперш – літоўскім і латышскім) і заходнеўкраінскім літаратурна-мастацкімі працэсамі, знаходзілася пад моцным уплывам, з аднаго боку, савецкай, а з другога – еўрапейскіх літаратур і культур (чэшскай, славацкай, нямецкай і інш.). Усё гэта забяспечыла эвалюцыю і фарміраванне ў ёй розных, часам нават супрацьлеглых ідэйна-светапоглядных і мастацка-выяўленчых канстант і ліній. Традыцыйная для беларускай літаратуры парадыгма рэалістычнага, лірыка-апавядальнага адлюстравання рэчаіснасці спалучалася ў ёй з наватарскім дыскурсам – асаблівасцямі суб'ектыўна-ідэалістычнага, духоўна-ірацыянальнага пазнання жыцця і чалавека. Радыкальна-рэвалюцыйны фундаменталізм з яго жорсткімі класава-ідэалагічнымі ўстаноўкамі і сцвярджэннем прынцыпаў адмабілізаванай падпольшчыцкай барацьбы і шырокага народна-вызваленчага руху пераплятаўся з ідэямі рэлігійнай філасофіі і хрысціянскага гуманізму. Нацыянальна-адраджэнскія тэндэнцыі і заканамернасці дапаўняліся і ўзмацняліся рамантычна-ўзвышаным пафасам.

Пра ўсё гэта магла толькі марыць тагачасная беларуская савецкая паэзія...

Дзякуючы працам (кнігам, раздзелам у калектыўных манаграфіях і вучэбных дапаможніках, артыкулам і іншым публікацыям) найперш У. Калесніка, А. Ліса і М. Арочкі сёння мы, здаецца, някепска ведаем творчасць прыхільнікаў пракамуністычнай, прасавецкай ідэйнай арыентацыі – Максіма Танка, Валянціна Таўлая, Піліпа Пестрака, Міхася Васілька, Міколы Засіма, Анатоля Іверса, у меншай ступені – Леапольда Родзевіча, Алеся Салагуба, Ніны Тарас, Ганны Новік, якія выступалі за далучэнне Заходняй Беларусі да БССР у складзе Савецкага Саюза. Але ж не варта забываць пра тое, што там, у Заходняй Беларусі, жылі і паспяхова тварылі прадстаўнікі супрацьлеглага, правага ідэйна-палітычнага крыла, а таксама так званыя цэнтрысты, што ўжо тады актыўна адстойвалі прынцыпы самастойнага, незалежнага развіцця Беларусі, і іх у цэлым было нашмат болей, чым левых. А гэта не толькі такія значныя творчыя індывідуальнасці, як Казімір Сваяк, Андрэй Зязюля, Наталля Арсеннева, Аўген Бартуль, Хведар Ілляшэвіч, Ларыса Геніюш, але і, на першы погляд, радавыя, непрыкметныя асобы – Янка Быліна, Вінцук Адважны, Station Станіслаў Станкевіч, Франук Грышкевіч, Пётр Сяўрук, Юльян Сергіевіч, Пётр Сакол, Уладыслаў Казлоўшчык... Усе яны, між іншым, мелі выдадзеныя ці падрыхтаваныя да выдання кнігі, зборнікі вершаў. А былі яшчэ таксама таленавітыя, апантаныя творчасцю Мар'ян Пецюкевіч, Алесь Смаленец, Янка Маланка, Вольга Сахарава, Раса, Аркадзь Заранка, С. Гаротны, Мікалай Базылюк, К. Рагойша, Янка Чорны і многія іншыя паэты, даволі звонкія галасы якіх убіраліся ў сілу, лунал у заходнебеларускім паднябессі і шмат абяцалі нацыянальнай літаратурнай будучыні. Аднак іх творчая дзейнасць, за рэдкім выключэннем, амаль не даследавана нашым літаратуразнаўствам.

Прыкметнае месца ў літаратурна-мастацкім працэсе і грамадска-культурным жыцці Заходняй Беларусі належала Янку Быліне, Станіславу Станкевічу і Улад-Ініцкаму, творчасць якіх зусім невядомая нашай сучаснай грамадскай супольнасці. А гэта былі на той час значныя мастацкія індывідуальнасці, актыўныя і прадуктыўныя дзеячы на ніве нацыянальнага адраджэння, развіцця беларускай асветы і культуры. Усе трое сімпатызавалі ідэям і каштоўнасцям Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, адстойвалі прынцыпы незалежнасці і самастойнасці аб'яднанай Беларусі і належалі фактычна да аднаго ўзроставага пакалення ў заходнебеларускай літаратуры, нават да адной мастацка-стылявой плыні.

Янка Быліна (сапр. – Іван Семашкевіч; карыстаўся таксама псеўданімам Ядловец, крыптанімамі Я. Б., J. B.) нарадзіўся 30 кастрычніка 1883 г. у вёсцы Лакцяны Свянцянскага павета Віленскай губерні (цяпер Астравецкі раён Гродзенскай вобласці) у беднай сялянскай сям'і. Беларускі рымска-каталіцкі святар, паэт і драматург. Пасля заканчэння Віленскай духоўнай семінарыі (1907 г.) і пасвячэння ў святары служыў ксяндзом (вікарыем і пробашчам) у касцёлах спачатку на Слонімшчыне, Вілейшчыне і Ашмяншчыне, а затым на Віленшчыне. З часоў вучобы ў семінарыі падтрымліваў блізкія сяброўскія адносіны з вядомымі дзеячамі на ніве беларускага каталіцкага духавенства Ф. Грынкевічам, У. Талочкам, Ф. Рамейкам. Пазней у сваёй грамадска-культурнай працы і касцельнай службе зблізіўся з лідарамі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі А. Станкевічам, К. Сваяком, Я. Пазняком. Падчас Першай сусветнай вайны разам з У. Талочкам прадстаўляў беларускае каталіцкае духавенства ў Віленскім камітэце дапамогі пацярпелым ад вайны. У 1917–1918 гг. прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні ў Вільні вядомай беларускай канферэнцыі. Напачатку 1930-х гг. быў пераведзены на Беласточчыну, служыў у Янаве-Падляскім (1933–1937 гг.) і Ялоўцы (1937–1939 гг.).

Сваю грамадска-культурную і пастырскую дзейнасць Я. Быліна ажыццяўляў на беларускай мове, ён актыўна выступаў за беларусізацыю ўсяго хрысціянска-рэлігійнага жыцця беларусаў у Польшчы, за што адчуваў праслед ад афіцыйнага Касцёла і ўлад II Рэчы Паспалітай.

Пачынаючы з 1917 г. вершы Я. Быліны друкаваліся ў газетах і часопісах «Гоман», «Беларуская крыніца», «Хрысціянская думка», «Снапок», «Авадзень», «Маланка», «Шлях моладзі», «Калоссе» і інш. Па часе лепшыя з іх увайшлі ў зборнікі паэзіі «На прызбе» (1918 і 1924 гг.) і «На покуці» (1934 г.), аснову якіх складалі асаблівасці традыцыйнай народнай свядомасці, адлюстраванне знешняга свету падзей і фактаў. Вершы Я. Быліны мелі пераважна сюжэтна-навелістычны характар, яны адрозніваліся дакладнасцю і яснасцю думкі і пачуцця, спакойнай апавядальнай танальнасцю, ураўнаважанасцю гучання. Паэт рабіў стаўку на паказ падзеі ці працэсу праз апісанне іх матэрыяльна-прадметнага зместу, на традыцыйную для беларускай літаратуры аб'ектывізаваную вобразнасць, стрыманы па сваім каларыце і фарбах рэалістычны малюнак. Гэта засведчыў, напрыклад, верш «Вясна», напоўнены добрым адчуваннем прыроднага свету як крыніцы жыццядзейнасці чалавека, яго адвечных змен і зрухаў, гісторыка-этнаграфічных асаблівасцей народнага асяроддзя:

Заселянела рунь у полі,
Пралеска ў лесе зацьвіла,
Зьяўляцца сталі ўжо паволі
З-за мора госьці да сяла... [1, с. 43].

Прыход вясны, сцвярджаў аўтар, з'яўляецца важнай падзеяй у жыцці беларускай вёскі. Ён узрушыў дзяцей, якія, «Сабраўшысь... грамадой, // Крычаць над збурленай ракой – // Да кніжкі трудна іх прыгнаць», абудзіў мужыкоў, што занепакоены адвечнымі сялянскімі праблемамі і клопатамі, «быццам важныя паны», ходзяць і думаюць пра хуткае ворыва і сяўбу, прынёс доўгачаканую вольніцу каровам, якіх, пераждагнаўшы вярбою, выгналі ў поле, а яны «Бягуць... і бадуцца, // Ніяк спакойна не пасуцца» [1, с. 43, 44].

Характар лірычнага перажывання Я. Быліны вызначаўся імкненнем да раскрыцця аб'ектыўнай сутнасці падзей і працэсаў, якія адбыліся ці адбываліся ў грамадскім жыцці краю. У яго творчасці пераважала агульнае, тое, што абумоўлівалася асаблівасцямі народнага светабачання, ішло ад настрояў і мыслення шырокіх працоўных мас насельніцтва, сацыяльных і нацыянальных праблем і супярэчнасцей рэчаіснасці.

Цяжкая доля роднага краю атаясамлівалася ў свядомасці Я. Быліны з лёсам сухой бярозкі ў полі, з якой «Бура лісткі… пазрывала» (верш «Бярозка»). Настала вясна, «Аджыла ўсё, зелянее наўкола! // Расьце і цьвіце і сьпявае, як у раю!», аднак яна не рэагуе на змены ў прыродным асяроддзі. Духоўна-мастацкія абагульненні паэта вызначаліся шчырасцю і вынашанасцю перажыванняў, драматызмам адчування грамадскіх працэсаў:

Ох, доля твая, як магіла ў гаю,
Чаму-ж ня ўсьміхнецца ніколі нам міла?
О, родна зямелька, о, мілы мой краю!
Ось, доля твая, як магіла [2, с. 34].

Лірычны герой Я. Быліны суадносіў сябе з ветрыкам, які «сумна... завывае», «Горка так усё плача, плача бязупынна, // Як няшчасна маці на могілках сына». Ветрык імкнецца на свабоду, у «бесканечну даль, // Хоць сваю старонку» пакідаць яму вельмі шкада. У няволі, складаных духоўна-сацыяльных умовах мусіць жыць і лірычны герой паэта («Ох, жыву і плачу, як і ты ў полі»):

Млею на'т, як бачу, што з намі тварыцца,
Што ня маем права па-свойму маліцца.
Нашую зямельку вун бяруць чужынцы,
У Айчыны грудзі гоняць слуп граніцы.
У сырой зямлянцы з голаду мруць дзеці,
А бацькі гаруюць на чужым гдзесь сьвеце,
Ці можа ў турмах звоняць ланцугамі…
Ой, Божа наш, Божа, што тварыцца з намі! [1, с. 50].

Я. Быліна прызнаваўся ў любові да роднага краю, «Бацькаўшчыны-Беларусі», якая адна дадзена яму «ад Бога» «да сьмерці»: «Душу ёй і ўсё я аддаў бы на сьвеце… // Яе да магілы любіць буду верна!» [2, с. 33, 34]. «Хаця яна бедна і хоць так няшчасна, // Напэўне, другой я такой не спаткаю», – разважаў ён у вершы «Бацькаўшчына», – «Яна мне ў мысьлях, як зоранька ясна! // Ей толькі аднэй свае песьні сьпяваю» [2, с. 33].

Беларус не бачыў асветы, сам будучы галодным, «трудом сваім карміў» іншых, усе ім «пагаржалі // І толькі «хамам» называлі», а ён «астаўся, як той дуб, // Крэпкі, моцны сярод поля» [2, с. 36, 37].

Гэй ты, браце беларусе!
Ціж табе ўсё жыць у прымусе?
Ціж табе ў няволі гніць?
Праз век сьлёзы толькі ліць?
Енчыць жудасна ад болі,
Ня знаць шчасьця аніколі? –

пытаўся Я. Быліна і тут жа прапаноўваў:

Замяніся, браце ў сталь,
А кінь вокам сваім ў даль,
Глянь: народы ўсе свабодны,
Адзін ты, браточак родны,
У няволі так астаўся!
Вот чаго ты дачакаўся! [2, с. 35].

Значнае месца ў зборніках Я. Быліны займалі байкі. Яны закраналі нацыянальна-палітычныя і сацыяльныя праблемы і супярэчнасці заходнебеларускай рэчаіснасці, выяўлялі выпадкі нізкага ўзроўню духоўна-патрыятычнай самасвядомасці, маралі і культуры ў грамадстве, выкрывалі няроўнасць і ўціск, угодніцтва і палахлівасць («Блыха і пан», «Курыца», «Кабан і мурашкі», «Шчупак і рыбы» і інш.).

Акрамя паэтычных Я. Быліна пісаў драматургічныя творы, напрыклад, яму належыць цікавая, глыбокая па сваёй праблематыцы камедыя «Выбары старшыні» (1926 і 1938 гг.). Ён таксама апублікаваў рэлігійна-філасофскія, тэалагічныя працы «Ружанец да Найсвяцейшае Дзевы Марыі» (1928 г.), «Песні жальбы, або Набожныя разважанні аб муках і смерці Збаўцы Езуса Хрыста» (1929 г.), «Дарога крыжа» (1930 г.), якія мелі свайго чытача, былі запатрабаваны ў заходнебеларускім грамадстве.

Патрыятычныя і гумарыстычныя творы Я. Быліны былі шырока вядомы ў Заходняй Беларусі, яны выкарыстоўваліся аматарскімі калектывамі ў арганізацыі і правядзенні шматлікіх грамадска-культурных і асветніцка-адукацыйных мерапрыемстваў.

Блізкія да Я. Быліны ідэйна-мастацкія пошукі вёў гэтым часам паэт, кнігар, культурна-асветны дзеяч Станіслаў Станкевіч. Нарадзіўся ён 18 мая 1886 г. у вёсцы Арляняты на Ашмяншчыне ў шматдзетнай малазямельнай сялянскай сям'і. З ранніх гадоў займаўся цяжкой фізічнай працай на бацькоўскай гаспадарцы, авалодваў асновамі «вясковай адукацыі».

Да літаратуры, грамадска-патрыятычнай і культурніцкай дзейнасці С. Станкевіч прылучыўся яшчэ ў пецярбургскі перыяд свайго жыцця і працы (1903–1919 гг.). Менавіта ў Пецярбургу, куды ён патрапіў у пошуках лепшай долі, як напіша пазней у аўтабіяграфіі, праслужыўшы дагэтуль на вёсцы сем гадоў спярша «пастухом, а пасьля парабкам» [3, арк. 28], будучы паэт зблізіўся і пасябраваў з кіраўніком Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў прафесарам Б. Эпімах-Шыпілам, пазнаёміўся з маладым Я. Купалам, які вучыўся на агульнаадукацыйных курсах Чарняева і працаваў у выдавецкай суполцы «Загляне сонца і ў наша аконца», цесна кантактаваў у справе арганізацыі і правядзення шматлікіх імпрэз, вечарын і тэатральных пастановак з многімі прадстаўнікамі тамашняй беларускай грамадскасці, галоўным чынам, зразумела, моладзі. Жывучы з 1920 г. у Вільні, С. Станкевіч спачатку працаваў у кнігарні Беларускага выдавецкага таварыства, пасля адкрыў уласную, якая разгарнула свае філіі ў некаторых іншых гарадах і паступова ператварылася ў адзін з найвыдатнейшых беларускіх культурна-асветных асяродкаў горада і краю. «Хто із жыхароў б. Заходняй Беларусі ў перадваенным часе ня ведаў ягонай кнігарні, якая знаходзілася ў Вільні?.. – ставіў рытарычнае пытанне, прыгадваючы 1920–1930-я гг., Я. Шутовіч. – Хто да яго не заходзіў, каб па прыездзе ў Вільню адразу даведацца пра беларускія падручнікі, навуковыя кнігі, пра кнігі з беларускай літаратуры, мастацтва, купіць ці дарма дастаць беларускую газэту, даведацца пра беларускае жыццё ў Вільні і ў краі...» [3, арк. 34]. І далей разважаў: «Кнігарня Станкевіча была адным із асяродкаў прапаганды беларускай культуры, у некаторай ступені была неафіцыйным даведачным бюро. Кнігар Станкевіч добра ведаў кніжную справу, быў ён самадзейным энцыклапэдыстам і бібліофілам у галіне беларусазнаўства. Беларускія вучоныя, журналісты, пісьменнікі, працаўнікі навукі, культуры, асветы карысталі з цэнных паслуг Станкевіча ў набыцці патрэбнай ім літаратуры» [3, арк. 35].

С. Станкевіч падключыўся да дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, стаў яе сябрам, дапамагаў наладжваць працу гурткоў ТБШ і мастацкай самадзейнасці (сам спяваў у хоры Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, іграў у драмгуртку Беларускага нацыянальнага камітэта), бібліятэк-чытальняў, школ, займаўся, як цяпер бы сказалі, перспектыўнымі выдавецкімі праектамі (уваходзіў у савет Беларускага каталіцкага выдавецтва). На працягу доўгага часу ён сумесна з З. Верас укладаў і друкаваў адрыўныя беларускія календары, менавіта яго намаганнямі была перавыдадзена паэма «Тарас на Парнасе», выйшлі ў свет зборнікі «Флірт для ўсіх» і «Беларускі спеўнік».

Увесь гэты час, пачынаючы яшчэ з нашаніўскіх часоў, пецярбургскага перыяду, С. Станкевіч пісаў вершы, якія друкаваліся ў газетах «Крыніца», «Сялянская ніва», часопісах «Досвіткі», «Заранка», беларускіх календарах і інш. У 1926 г. пабачыў свет зборнік яго гумарыстычных вершаў «Смех – не грэх». Ён сведчыў пра наяўнасць у паэта выразнага лірыка-апавядальнага характару мастацкага светаадчування, значнага літаратурна-творчага патэнцыялу – жыццесцвярджальнага па сваім змесце і прыродзе, пра ўгрунтаванасць гэтага патэнцыялу ў асновы народнай самасвядомасці і маралі, настроі і перажыванні шырокіх грамадскіх слаёў насельніцтва.

У святле гумарыстычнай усмешкі паэта – займальныя бытавыя здарэнні («Маляваная лаўка», «Параіла!»), цікавыя і павучальныя выпадкі, звязаныя з купляй пэўнага тавару, жывёлы («Як Моўша купляў цялё?», «Сцяміў!»), некаторыя праблемы сямейных узаемадачыненняў, асаблівасці народных звычаяў і абрадаў («Далася ў знакі!», «Сваты»), чалавечыя памылкі і недахопы, звыклыя для беларусаў цямнота і прастадушнасць («П'яніца», «Растлумачыў!»). Як правіла, ён імкнуўся ўзняцца над канкрэтным матэрыялам рэчаіснасці, эпізодамі і фактамі жыцця свайго сучасніка, надаць ім абагульненае значэнне, завастрыць увагу чытача на істотна важных акалічнасцях сацыяльных абставін, адметных рысах характару героя, яго культуры і выхавання.

У якасці аднаго з відаў камічнага, адметных спосабаў раскрыцця жыццёвых працэсаў, унутранага свету чалавека на працягу доўгіх стагоддзяў у літаратуры развівалася і ўдасканальвалася сатыра. Прадметам іранічнага асмяяння і сатырычнага выкрыцця С. Станкевіча з'явіліся многія факты і дэталі сацыяльна-эканамічнага ўціску і несправядлівасці, нацыянальна-культурных абмежаванняў і рэгламентацый, палітычных забарон і пераследу ў Заходняй Беларусі, шматлікія абяцанні, якія давалі ды не выконвалі прадстаўнікі польскіх уладных структур, у прыватнасці, кіруючай партыі нацыянальнай дэмакратыі. Напрыклад, у вершы «Нехта – нейкі» ён удала абыграў

звычайны побытавы эпізод з гарадскіх варункаў, акцэнтаваў увагу на важнай і характарыстычнай палітычнай асаблівасці грамадскага жыцця – арыштах і зняволенні на Лукішках рэдактараў вядомых газет і часопісаў, якія публікавалі вострыя, прысвечаныя асэнсаванню набалелых праблем і супярэчнасцей заходнебеларускай рэчаіснасці матэрыялы і дакументы:

Нехта нейкі – хто там знае –
Падышоў аднойч да Грышкі,
Й шапку зняўшы ўраз пытае:
– «Як мне трапіць на Лукішкі?» [4, с. 33].

Грышка як чалавек шчыры і сумленны не замарудзіў адазвацца, «Разказаці стаў старацца, // Каб той болей ня пытаўся»:

– «Кабы – кажа – вам ня зьбіцца
І знайсьці «Лукішкі» гэты, –
Трэ’ рэдактарам зрабіцца
Беларускае газэты!»
На канчатак так гавора:
– «Нат тагды не аглянесься,
Як бяз клопату і скора
На «Лукішках» апынесься!» [4, с. 33].

Верш, як бачым, сюжэтна-апавядальны, роздумны па сваім характары, поўны тонкай іроніі і глыбокага народнага досціпу.

Шмат у чым тыповым для С. Станкевіча і паказальным у кантэксце нашых разважанняў з’яўляецца верш «Жабракі неспакойны», які таксама мае выразны сатырычна-гумарыстычны характар. Імкнучыся падкрэсліць складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця ў краі, невыносна цяжкія падаткі, якімі было абкладзена насельніцтва, аўтар карыстаўся прыёмам перабольшання, завастрэння сітуацыі, давядзення яе да абсурду: «Ці то праўда ёсьць, ці не, // Ня буду я спорыць, // Аднак чуць прышлося мне // Як людзі гавораць»,

Што пан Грабскі ўсё-такі
Завядзе парадкі,
Каб, нарэшце, й жабракі
Плацілі падаткі [4, с. 43].

Тэрмінова сабраўшыся на сход і абмеркаваўшы няпростую сітуацыю, абураныя жабракі пастанавілі не прызнаваць такія парадкі ўлады:

Лепш не станем жабраваць –
Будзем неяк жыці, –
А падаткі – трэ сказаць –
Ня будзем плаціці! [4, с. 44].

Даволі шырокая для свайго часу пастаноўка няпростых сацыяльных і нацыянальных пытанняў уласціва другому зборніку С. Станкевіча «З майго аконца» (1928 г.), які засведчыў відавочны ідэйна-мастацкі рост паэта. Ён поўніўся традыцыйнымі для беларускай літаратуры тэмамі, матывамі і вобразамі, шырока распаўсюджанымі як у творчасці Я. Коласа і Я. Купалы пачатку стагоддзя, так і многіх заходнебеларускіх аўтараў 1920-х гг. У ім паэт маляваў карціны людской нядолі, бязрадаснага існавання мужыка-беларуса, яго шматлікіх сацыяльна-бытавых няўладжанасцей і прыніжэння, «зьдзекаў і прымусаў», крытыкаваў існуючыя грамадскія парадкі, якія скоўвалі духоўную энергію народа, не давалі надзеі сацыяльным нізам на паляпшэнне іх умоў жыцця, пашырэнне правоў і свабод. Ён хацеў «бачыць сонейка над хатай, Што будзе грэць мой родны кут» («Надзея»), ставіў на мэце абудзіць народную грамаду ад сну і змрочнай маркоты, натхніць яе на актыўныя дзеянні па здабыцці сваёй волі, долі і шчасця, клікаў да аб’яднання, кансалідацыі сіл («Трэба сілу нам і згоду // Ўсяму сьвету паказаць...»):

Гэй! за волю ўсе змагацца,
Страсянеце вечны сон!
Годзі ў цемры так снавацца
І цярпець адно – прыгон! [5, с. 11].

У вершах С. Станкевіча са зборніка «З майго аконца» і тых, што не ўвайшлі ў яго, сустракаем традыцыйныя для нашай літаратуры звароты аўтара да долі, якой «усё не відаць» («Можа ты дзе ў няволі // І ня вырвацца табе...»), каб яна адазвалася, прынесла лепшы, памысны лёс («Эй! Ты доля...»), да чарговага Новага года, ад якога чакаюць добрых змен і зрухаў у жыцці, з якім «Няхай-жа загляне час лепшы...»: «Ці жудкія зьдзекі нясе // Твой прыход, // Ці воляй нарэшце пацешыш Народ!» («З Новым годам»). Ён апеляваў да волі, што недзе «так марудзіць» і невядома, «да нас калі прыблудзіць...» («Родная вёска»), горача сцвярджаў: «Годзі ўжо цярпець нам ціха // І пакорна сьпіну гнуць!.. // Мы ня хочам, нам даволі // Гнуцца, плакаць, бядаваць!» («Годзі»), заклікаў актывізавацца, здабыць волю сваімі рукамі, працаваць, каб «растацца з бядою» і «долю... здабыць»: «Да працы усе грамадою // Мы пойдзем, браточкі, хутчэй, // Бо трэба растацца з бядою...» («Да працы»). Як і ў многіх яго папярэднікаў і сучаснікаў, покліч «Да працы» гучаў у паэта ў адным змястава-асацыятыўным полі з поклічам прыступіць «адважна да дзела», каб «Беларусь будаваць», парупіцца ўсім, «Хто долі жадае Народу», «За Маць-Беларусь, за свабоду...» [5, с. 9].

У вершы-звароце «Не пакінем...» С. Станкевіч заклікаў шматлікіх беларускіх патрыётаў, сваіх аднадумцаў і паплечнікаў па грамадска-культурнай дзейнасці, і надалей не пакідаць «зямелькі і Краю, // Дзе калісь нашы продкі жылі, // Тых палёў, сенажацяў і гаю, // Дзе крывавы свой пот пралілі...» [5, с. 7]. Руплівую і ахвярную працу на абсягах роднай нівы, ворыва і засеў яе жыццядайным зернем, каб яна «Каласамі буйнымі шумела // І збор добры давала для нас», ён непасрэдна звязваў з каваннем народнай долі і развіццём беларускай культуры:

Каб забыці пра гора й нядолю,
На апеку ня станем чакаць!
Будзем самі каваць сабе долю
І культуру сваю пашыраць! [5, с. 7].

Сацыяльнае і нацыянальнае, матэрыяльнае і духоўнае, хлеб і асвета, культура ўспрымаліся паэтам як адзінае цэлае, у святле вялікай грамадзянска-патрыятычнай праблемы, вырашэнне якой адыгрывала для беларускага народа лёсавызначальную ролю.

С. Станкевіч не сумняваўся ў праўдзівасці і правільнасці сваіх духоўна-маральных крытэрыяў, арыенціраў і ідэйных пазіцый, у цэлым абранага шляху; увесь яго зборнік пранізвае матыў веры ў будучыню роднага краю, незалежнае развіццё Беларусі і яе народа. У вершы «Аб прошлым» ён закранаў асаблівасці гістарычнага лёсу беларусаў, выяўляў некаторыя быційна-філасофскія аспекты нацыянальнага мінулага. А ў вершы «Да Беларусі» выказваў цвёрдую ўпэўненасць у тым, што «Згінуць зьдзекі і прымусы», «Нам засьвеце міла сонца, // Закрасуе наша ніва», паэтызаваў красу і сілу жыватворнай роднай мовы як духоўна-маральнага грунту жыццядзейнасці і самасцвярджэння народа, яго паступальнага руху наперад, як дамінанты нацыянальнай свядомасці і культуры:

Беларусь, жыла й жыць будзеш! –
То дарма, што вораг страша,
Бо дасюль, дзе не заблудзіш,
Жыве ўсюды мова наша!

А пакуль жыве ў нас мова,
Не загіне край наш родны... [5, с. 6].

За сваю паслядоўную грамадзянска-патрыятычную пазіцыю, актыўную дзейнасць па развіцці беларускай нацыянальнай свядомасці і прапагандзе беларускага мастацкага слова, адстойванні правоў беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы С. Станкевіч, як і Я. Быліна, зведаў пераслед і ганенні з боку ўладных структур ІІ Рэчы Паспалітай.

Варта заўважыць, што большасць твораў Я. Быліны і С. Станкевіча былі прасякнуты рытарычнасцю і дэкларацыйнасцю, пераказам наяўных і магчымых падзей і фактаў рэчаіснасці, дыдактычнымі парадамі і заклікамі агульнагуманістычнага характару, канстатацыяй эмацыянальна-пачуццёвага стану лірычнага героя, але, што істотна важна, былі сагрэты светлымі думкамі і шчырымі перажываннямі, высакароднымі памкненнямі аўтара, заключалі ў сабе ёмісты пазітыўны змест, неслі значны зарад жыццесцвярджальнай энергетыкі.

Што датычыць Улад-Ініцкага, дык ён быў крыху маладзейшы за Я. Быліну і С. Станкевіча, але не намнога.

Улад-Ініцкі (сапр. – Уладзіслаў Міхайлавіч Паўлюкоўскі; падпісваўся таксама псеўданімамі У.-Ініцкі, Улад. Ініцкі, Уладз. Ініцкі, Улад.-Ініцкі, У. І. Ніцкі, Унучак, Унучкаў Зямляк, крыптанімамі У. Паў-скі, Ул. Паў-скі, У. І., У.-І. і інш.) нарадзіўся 13 мая 1895 г. у вёсцы Ініца Навагрудскага павета Мінскай губерні (цяпер Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці) у шматдзетнай сялянскай сям'і. Паэт, празаік, публіцыст, мастак, краязнаўца, этнограф. З ранніх гадоў выявіў няўрымслівы, настойлівы, мэтанакіраваны характар і прагу да ведаў. Скончыў пачатковую школу ў Стоўбцах, гарадскую школу ў Навагрудку, вучыўся ў Харкаўскім мастацкім вучылішчы.

Пошукавая, дапытлівая натура будучага пісьменніка і мастака, якая ўвесь час шукала шляхоў і магчымасцей для сваёй рэалізацыі і самасцвярджэння, у сярэдзіне 1920-х гг. прывяла яго ў Вільню. Уступіўшы ў шэрагі Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Улад-Ініцкі бярэ актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах гэтай масавай народнай арганізацыі, супрацоўнічае ў яе перыёдыках.

У Вільні напоўніцу раскрыліся арганізатарскія і творчыя здольнасці Улад-Ініцкага: ён наладжвае шматлікія цікавыя і пазнавальныя культурна-асветніцкія імпрэзы, лекцыі па культуралогіі і этнаграфіі беларусаў, выступае як фалькларыст, тэарэтык і практык жывапісу і графікі. Як мастак-графік і фотамайстра спрычыняецца да выдання знакамітых віленскіх календароў-гадавікоў, падручнікаў, фотаальбомаў, буклетаў, розных папулярных дапаможнікаў па мастацтве, разьбе па дрэве. Дарэчы, ён па-майстэрску вырабляе невялікія абразы, якія карыстаюцца шырокім попытам у грамадскім асяроддзі.

Першыя публікацыі Улад-Ініцкага адносяцца да 1926 г. У другой палове 1920-х гг. яго артыкулы, вершы, замалёўкі, апавяданні друкуюцца ў газетах і часопісах «Народная справа», «Наша праўда», «Слова працы», «Сялянская ніва», «Сцяг працы», «Маланка», «Грамадзянін» і іншых. У 1928 г. пабачыла свет кніга паэзіі Улад-Ініцкага «Сон Гаўрылы і розныя вершы», у 1929 г. – зборнік паэзіі «Клім бабаю і іншыя жарты» і кніга прозы «Апавяданні».

У вершаваных творах Улад-Ініцкага выявіліся асаблівасці народнага светабачання і ўспрымання, раскрыліся тэмы, матывы і вобразы сацыяльна-этнаграфічнага напаўнення. Чытаючы іх, пераконваешся ў тым, што паэт быў цесна звязаны з жыццём роднага краю, праблемамі і бедамі сялянскай масы, добра адчуваў і ўсведамляў духоўна-маральную энергетыку працоўнага асяроддзя, яго спаконвечную філасофію жыццядзейнасці на зямлі і мыслення, пераймаў яе і натхняўся ёю. Лірычны герой верша «Мне сумна...» са зборніка «Сон Гаўрылы і розныя вершы» бачыў «вольны блакітны прастор, // Скуль сонца зямлі усьміхаецца, // Дзе радасьцю сьвецяцца тысячы зор, // Дзе месяц у хмарках купаецца», чуў, як у «шмарагдах цяністых лясоў» «птушкі шчабечуць гульлівыя», нават «Як мошкі зьвіняць над каберцам з лугоў, // Вясёлыя мошкі, шчасьлівыя», але не атрымліваў задавальнення, не перажываў пачуцця радасці. Наадварот, яму было «сумна й маркотна», у яго балела душа, бо родны край «спавіты туманамі, // Бо цяжкае гора на людзях ляжыць, // З крываваю працай спазнанымі» [6, с. 20].

Творчая індывідуальнасць Улад-Ініцкага таксама развівалася ў рэчышчы лірыка-апавядальнай стылявой плыні заходнебеларускай паэзіі. Услед за сваімі папярэднікамі паэт ставіў пытанні грамадска-прававога ўрэгулявання, сацыяльнай і нацыянальнай няроўнасці, выхавання і развіцця этнасвядомасці працоўных мас, культуры і асветы сялянства. У вершы «Доля» ён наракае на складанасці, бядоту і беспрасветнасць жыцця, жаліцца на цяжкую долю, якая «дужа рана з ім запазналася і шчыра ў яго закахалася», называе яе сумнаю, сірочаю, бязвольнаю, жабрацкаю. Аднак скаргі і нараканні лірычнага героя паступова змяняюцца палемікай і спрэчкай з доляю («Ходзіш, як цень, ты за мной неадлучная, // Доля бясслаўная, доля бязгучная...»), пераходзяць у яе адкрытае непрыняцце і выразны пратэст:

Эх, ты, праклятая доля, паганая,
Кінь ты, адстань ад мяне, пагарджаная,
Дай мне зірнуці на радасьць раздольную,
Дай мне пачуці, эх... волейку вольную! [6, с. 19].

У форме запытанняў і характэрнай рэакцыі на іх, своеасаблівых адказаў пабудаваны верш, які так і называецца – «Пытанні і адказы». Лірычны герой шукае шчасця, радасці і волі ў жыцці, па даўняй народнай традыцыі апелюе да прыродных з'яў, звяртаецца да зоркі, сонца, ветру. Яны, як вядома, увасабляюць глыбіню і неабсяжнасць касмічнай прасторы, непераўзыдзенасць жыццесцвярджальнага пачатку, гуманістычнай ідэі, іх веліч і дабратворнасць, сімвалізуюць рух, абнаўленне, пазітыўныя змены ў лёсе чалавека і навакольнай рэчаіснасці, нясуць веру ва ўдачу, поспех і шчасце. На жаль, яго пошукі не даюць належнага выніку.

Тым не менш адзнак трагічнай абумоўленасці, фатальнасці зместу матыў народнай няволі і нядолі ў вершах паэта не набываў. Чытаючы іх, разумееш: аўтар верыў у прыход светлых дзён, пазітыўных грамадскіх змен і зрухаў, што «ня згіне думка тая», якая жыве ў народзе і «Няўпынна выяўляе // Долю лепшую ў свабодзе»:

Ні вастрожнымі мурамі
Не агорнеш думку тую,
Ні кандалаў ланцугамі
Ня скуеш яе, сьвятую.
Не патухне іскра тая,
Што у сэрцах люду тлее,
Шчасьце ў далі асьвятляе
І жыцьцё надзеяй грэе [6, с. 21].

У шэрагу твораў Улад-Ініцкага вера і сацыяльны аптымізм раскрываліся праз выразныя сімвалічныя і алегарычныя вобразы і асацыяцыі, якія некалі з'яўляліся носьбітамі пісьма паэтаўнашаніўцаў. Верш «Не сумуйце», напрыклад, пэўнымі зместавымі асаблівасцямі, вобразна-метафарычным малюнкам і мастацкай стылістыкай перагукваецца з вядомым коласаўскім «Не бядуй», цалкам вытрыманым у характэрным сімваліка-алегарычным плане («Не бядуй, што звіслі хмары, // Што нам сонца не відаць...»):

Ня сумуйце, што па небу
Хмары чорныя гуляюць
І дажджом палі пустыя
Бязупынна паліваюць.
Ня сумуйце, што халодны
Вецер сьвішча, завывае
І лісточкі залацісты
З дрэў бяз літасьці зрывае.

Ня сумуйце, бо ня вечна
Будзе восень, непагоды...
Час надыйдзе і вясною
Прывітае ўсе народы! [6, с. 22].

Вядома, зусім не выпадковымі былі ў творчасці паэта астрожныя матывы, вобразы кайданоў, ланцугоў, цёмных сырых сцен, кратаў і г. д. Актыўная грамадзянска-патрыятычная дзейнасць Улад-Ініцкага адсочвалася польскімі спецыяльнымі органамі, яго неаднойчы затрымлівалі, арыштоўвалі і катавалі ў пастарунку. У 1926 г. за супрацьпраўную дзейнасць у адносінах да польскай дзяржавы паэт быў асуджаны віленскім судом і амаль на год кінуты ў знакамітую турму Лукішкі.

Астрожныя вершы Улад-Ініцкага вызначаліся тым, што ў іх даволі натуральна суіснавалі, сувымяраючыся між сабою, пераважна прадметна-рэчыўны лад адчуванняў аўтара, яго ўцягнутасць у цяжкую канкрэтыку паўсядзённасці і індывідуальна-пачуццёвы свет прыватнай асобы, яе суб'ектыўна афарбаваныя назіранні і роздум. Як правіла, эмацыянальны пачатак, душэўналірычны струмень наслойваліся ў іх на эпічна-падзейны стрыжань, вонкава-апісальныя малюнкі і накіды. Цалкам у адзначаным аспекце вытрыманы вершы «У астрозе», «Адзіночка (на Лукішках)» і інш. Вялікае, агульнае, грамадска-сацыяльнае спалучаецца ў іх з малым, але дужа ўстойлівым і моцным прыватным, індывідуальным, асобасным, канкрэтна-гістарычнае пераплятаецца

з агульнапаняційным, умоўна-асацыятыўным, абстрактным, прадметна-рэчыўнае – з душэўна-пачуццёвым, псіхалагічным і г. д.

Варта заўважыць, што ў сярэдзіне 1939 г. за сваю беларускую нацыянальна-патрыятычную дзейнасць Улад-Ініцкі паўторна быў асуджаны польскім судом. На гэты раз яго зняволілі ў сумна вядомы Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер.

Кожны ці амаль кожны наступны верш Улад-Ініцкага дадаваў колькі новых штрыхоў у плане мастацкага самавыяўлення аўтара, раскрыцця свету яго думак і пачуццяў, адносін да праблем і супярэчнасцей грамадска-сацыяльнага жыцця ў Заходняй Беларусі. Але, што характэрна, у адрозненне ад твораў многіх іншых паэтаў, напрыклад, М. Танка, В. Таўлая, М. Васілька, М. Засіма, у яго зборніках мы фактычна не сустрэнем заклікаў да актыўных дзеянняў, ісці ў масы, абуджаць іх да супрацьстаяння прыгнёту і несправядлівасці, крыўдзе і няшчасцю. Улад-Ініцкі, натуральна, падтрымліваў ідэі сацыяльнай актыўнасці, непакоры і змагання, салідарызаваўся з народным рухам за волю і шчасце, чалавечую годнасць, аднак яго абвінаваўчыя інвектывы, пратэст і непрыняцце бяспраўя і прыніжанасці мужыка-беларуса не гучалі ў адкрытай, публіцыстычнай форме, а былі прытоены ў самім праблемна-тэматычным змесце, вобразнай тканіне вершаў. Гэта былі не прамоўніцкія, не агітацыйныя творы. Наадварот, яны вызначаліся стрыманасцю меркаванняў і ацэнак аўтара, яго памяркоўнай разважлівасцю, засяроджаным роздумам, даволі часта тонкай іроніяй і падтэкстам («Па смерці», «Крыгалом» і інш.).

Жартоўныя паэтычныя творы Улад-Ініцкага былі прысвечаны апісанню цікавых і займальных выпадкаў з жыцця вясковага асяроддзя, высмейванню пэўных рыс характару і паводзін селяніна. Ім уласцівы адценні мяккага, стрыманага, добразычлівага гумару аўтара, трапныя, дасціпныя назіранні і замалёўкі («Клім бабаю», «На рынку» і інш.).

Як бачым, у той час, калі ў паэзіі Савецкай Беларусі адбываўся працэс разбурэння нашаніўскай нормы, заходнебеларуская была звернута да яе актыўнага сцвярджэння і развіцця. Творчасць прыхільнікаў гэтай стылявой арыентацыі грунтавалася на факце, падзеі, здарэнні, непасрэднасці, а часта і наіўнасці адчуванняў і ўяўленняў і вызначалася рэалістычным адлюстраваннем рэчаіснасці.

**Высновы.** Ідэйна-мастацкія пошукі Янкі Быліны, Станіслава Станкевіча і Улад-Ініцкага – прыкметная старонка літаратурнай гісторыі Заходняй Беларусі. Яны звярталіся да актуальных праблем і супярэчнасцей заходнебеларускай рэчаіснасці, раскрывалі характэрныя асаблівасці духоўна-сацыяльнай свядомасці беларускага народа на адным з самых складаных этапаў яго гістарычнай жыццядзейнасці па шляху да дзяржаўнай незалежнасці і суверэнітэту. У творах паэтаў пераважалі структуры павольнага аповеду, нязмушанага расказу, яснасці і прастаты зместу, абмалёўкі характэрных дэталей і падрабязнасцей жыцця чалавека, выяўлення зрокаванаглядных карцін і малюнкаў. Ім былі ўласцівы асаблівасці традыцыйнай паэтыкі, сістэмы сродкаў мастацкай выразнасці.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Быліна, Я. На покуці : байкі і розныя вершы / Я. Быліна. – Вільня : Выд-ва Беларус. ін-ту гасп-кі і культуры, 1934. – 72 с.

2. Bylina, J. Na pryźbie : [вершы] / J. Bylina. – Wyd. 2-e. – Wilnia : Biełarus. wydaw. t-wa, 1924. – 57 s.

3. Беларуская энцыклапедыя. Матэрыялы і бібліяграфія (артыкулы і газетныя выразкі біяграфічнага характару) // ЦНБ НАН Беларусі, Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 84.

4. Stankiewič, St. Śmiech – nia hrech : humarystyčnyja wieršy / St. Stankiewič. – Wilnia : Biełarus. druk. im. Franciška Skaryny, 1926. – 64 s.

5. Станкевіч, С. З майго ваконца / С. Станкевіч. – Вільня : Выд. Я. Гапановіча, 1928. – 64 с.

6. Улад-Ініцкі. Сон Гаўрылы : і розныя вершы / Улад-Ініцкі. – Вільня : Выд-ва У. Знамяроўскага, 1928. – 36 с.

## References

1. Bylina Y. *In the red corner: tales and various poems.* Vilnia, Published by the Belarusian Institute of Economy and Culture, 1934. 72 p. (in Belarusian).

2. Bylina Y. *At a small mound.* 2nd ed. Vilnia, Belarusian Publishing Society, 1924. 57 p. (in Belarusian).

3. Belarusian encyclopedia. Materials and bibliography (bibliographic articles and newspaper clippings). *Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus*, *Department of Rare Books and Manuscripts*. F. 1. Vop. 1. Item 84 (in Belarusian).

4. Stankevich S. *Laughter is not a sin: humorous poems.* Vilnia, Belaruskaya drukarnya im. F. Skaryny Publ., 1926. 64 p. (in Belarusian).

5. Stankevich S. *From my window.* Vilnius, Ya. Gapanovich Publ., 1928. 64 p. (in Belarusian).

6. Paulyukouski U. *Gaurila's dream and various poems.* Vilnia, U. Znamyarouski Publ., 1928. 36 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Микулич Николай Владимирович** – кандидат филологических наук, доцент, заведующий отделом взаимосвязей литератур. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: mikmik43@gmail.com

## Information about the author

**Mikalai U. Mikulich** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor, Head of the Department of Literary Relationships. Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: mikmik43@gmail.com